

# Святочны бібліябум: пешшу па выставах

**Кожны год 15 верасня супрацоўнікі бібліятэк, а з імі і шматлікія чытачы, адзначаюць прафесійнае свята. Дзень бібліятэк з'явіўся ў нашай краіне па ўказе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2001 годзе. І дата святкавання абраная не выпадкова — у гонар дня заснавання Нацыянальнай бібліятэкі, якая сёлета спраўляе 100-гадовы юбілей. Што зараз адбываецца ў галоўным кнігасховішчы краіны? Пройдземся разам з наведвальнікамі па актуальных праектах "дыямента ведаў".**

### МІР І БЯСПЕКА ДЛЯ ЎСІХ

Тэматычная кніжная выстава, прымеркаваная да Міжнароднага дня міру, знаёміць карыстальнікаў бібліятэкі са шматгранпай дзейнасцю Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і іншых міжнародных арганізацый у галіне падтрымання міру і міжнароднай бяспекі.

Экспазіцыя налічвае каля 100 дакументаў на рускай, англійскай і нямецкай мовах. Сярод экспанатаў — міжнародныя прававыя дакументы, энцыклапедыі і даведнікі, манаграфіі, матэрыялы даследаванняў па праблемах вайны і міру, палітыка-прававыя даследаванні па мерах умацавання даверу і бяспекі, матэрыялы навукова-практычных канферэнцый, круглых сталоў, навуковыя даклады, навучальныя дапаможнікі.

### КНІЖНАЕ СТАГОДДЗЕ

У цэнтры экспазіцыі, якая была падрыхтавана да Дня беларускага пісьменства, — Год гістарычнай памяці.

Гэта інтэрактыўная прастора — магчымасць дакрануцца да ўзнаўленняў знакавых узораў айчыннай кніжнай культуры, стаць удзельнікам тэматычнай віктарыны "Загадкі кніжнай скарбніцы", павіншаваць бібліятэку і пакінуць свае пажаданні.

А паглыбіць веды пра гісторыю роднай краіны дапамогуць электронны інфармацыйны рэсурс "Гісторыя бібліятэчнай справы Беларусі" і тэматычная прэзентацыя "Гомельшчына ў рэсурсах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі".

### БІБЛІЯКОМПАС

У межах святкавання 100-гадовага юбілею адкрыўся адмысловы выставачны праект. У ім прадстаўлены шматлікія падарункі партнёраў, гасцей, сяброў і чытачоў бібліятэкі: кнігі з аўтографамі беларускіх пісьменнікаў, даследчыкаў, вучоных, мастакоў; нацыянальныя сувеніры і прадметы адзення з розных краін свету, факсімільныя ўзнаўленні кніжных помнікаў, альбомныя выданні ад прыватных асоб і замежных дэлегацый з краін Еўропы, Азіі, Афрыкі; жывапісныя палотны, калажныя работы, акварэльныя замалёўкі, фотапластыка.

Асобнае месца ў экспазіцыі — узнагароды і падзякі, атрыманыя бібліятэкай. Сярод іх: за паспяховую працу ў ажыццяўленні выдавецкіх праектаў па захаванні і папулярызацыі кніжнай спадчыны, за актыўную дзейнасць у сферы міжнароднага гуманітарнага супрацоўніцтва і іншыя.

### УЧОРА, СЁННЯ, ЗАЎТРА

Гэты фотапраект таксама прымеркаваны да 100-гадовага юбілею бібліятэкі. Тут можна ўбачыць архіўныя і сучасныя мастацкія фотаздымкі, большасць з іх экспануецца ўпершыню. У праекце прынялі ўдзел вядомыя сучасныя беларускія фотамастакі, члены Саюза фатографаў Беларусі і народнага фотаклуба "Мінск".

Фотаздымкі вобразна ўзгадваюць мінулае бібліятэкі, нібыта гартаюць старонкі яе стогадовай гісторыі. Індывідуальны стыль, почырк фотамастакоў дазваляюць убачыць сучаснае і будучыню ўстановы праз прызму аўтарскага творчага ўяўлення.

### ТУРЫЗМ У XXI СТАГОДДЗІ

Дадзеная кніжная выстава прысвечана Сусветнаму дню турызму.

Тут прадстаўлена больш за 100 дакументаў: кнігі, брашуры, перыядычныя выданні, мімеаграфаваныя матэрыялы. Вялікую частку складаюць дакументы міжнародных арганізацый на рускай, французскай і англійскай мовах. Матэрыялы экспазіцыі датычаць прававога забеспячэння міжнароднага турызму, ролі і значэння турызму ў эканамічным і сацыяльным развіцці краін і рэгіёнаў, развіцця індустрыі турызму і турыстычнага бізнесу ў Рэспубліцы Беларусь і інш.

### УЗЛЁТ МУЗЫЧНАЙ ДУМКІ

Канцэрт-лекцыя — сумесны праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і арт-прасторы "Свет класічнай музыкі".

Цыкл сустрэч "Прагулкі скрозь стагоддзі" раскрывае гісторыю развіцця класічнай музыкі. Кожную апошнюю суботу месяца наведвальнікаў бібліятэкі чакае знаёмства з шэдэўрамі акадэмічнай музыкі ў выкананні музыкантаў-аматараў. Выкананне будзе дапоўненае расповедам пра кампазітараў і гісторыю з'яўлення асобных твораў, а таксама маляўнічай прэзентацыяй з панарамай культурнага жыцця эпохі: яе архітэктуры, жывапісу, літаратуры, моды.

Ганна САКАЛОВА



Агульная чытальная зала



Зала нотных і аўдыявізуальных дакументаў

